



**Паважаныя чытачы!** Прапануем вашай увазе спецыяльны нумар часопіса, падрыхтаваны сумесна з Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь і пры падтрымцы яго генеральнага партнёра — замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю "Джапан Табака Інтэрнэшнл Эс Энд Дзі".

# НАШ МУЗЕЙ САПРАЎДЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ І ГІСТАРЫЧНЫ

## *Інтэрв'ю галоўнага рэдактара часопіса Максіма Гальпяровіча з дырэктарам Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Паўлам Сапоцькам*

**— Павел Міхайлавіч, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь мае цікавую, але няпростую гісторыю, часам нават цяжка зразумець, ад якой даты яе адлічваць. Калі ж усё-такі яна пачынаецца?**

— Музей пачынае сваю гісторыю ад 1956 года, калі Саветам Міністраў БССР было прынята рашэнне аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея. Тым не менш мы робім адсылку да 1919 года, часу стварэння Мінскага абласнога музея, таму што фонды нашага музея былі заснаваныя на базе тых калекцый, якія існавалі менавіта ў гэтым музеі. Пазней ён стаў называцца Беларускім дзяржаўным музеем, яшчэ не раз мяняў сваю назву. Але падчас Вялікай Айчыннай вайны яго фонды былі вывезеныя ў Германію ці разрабаваныя. У выніку ён спыніў сваё існаванне. Толькі ў 1956 годзе пачалося стварэнне Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея. Ён таксама называўся па-рознаму, пакуль не атрымаў у 2009 годзе назву Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, мы маглі б сёлета адзначаць 100-годдзе, але навукова абгрунтаваных падстаў для гэтага няма, нягледзячы на тое, што ў музейнай практыцы ёсць традыцыя, калі гісторыя музея адлічваецца ад першага прадмета, які трапіў у тую ці іншую калекцыю, а пазней быў уведзены ў кантэкст экспазіцыі музея. Больш за тое, мы можам распачынаць сваю гісторыю і ад Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага музея, створанага ў 1909 годзе, бо менавіта яго калекцыі сталі асновай збораў Мінскага абласнога музея, многія з яго экспанатаў захоўваюцца ў нас і сёння. Але ўсё ж такі мы адлічваем сваю гісторыю ад 1956 года. Тым не менш мы заўсёды кажам і ганарымся тым, што нашы фонды, нашы калекцыі вядуць сваю гісторыю ад музеяў-папярэднікаў.

**— Вядома, што ў выніку Першай і Другой сусветнай войнаў, розных падзей міжваеннага часу Беларусь страціла значную частку гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны фонды музея былі вывезеныя ў Германію ці разрабаваныя, і далёка не ўсе экс-**



***САПОЦЬКА Павел Міхайлавіч.***

*Дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Нарадзіўся ў 1992 г. у г. Маладзечна. У 2013 г. закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці "культуралогія" (спецыялізацыя "менеджмент сацыяльнай і культурнай сферы"), магістратуру (2014 г.) і аспірантуру (2019 г.) па спецыяльнасці "тэорыя і гісторыя культуры". Старшы выкладчык кафедры міжкультурных камунікацый БДУКіМ. Член экспертнага савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Двойчы стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2011, 2015 гг.). Лаўрэат Прэміі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ў сферы культуры і мастацтва (2017 г.). Аўтар больш за 40 навуковых артыкулаў, апублікаваных у Беларусі, Расіі, Украіне, Літве, а таксама больш за 130 публікацый у СМІ.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

**панаты вярнуліся ў Беларусь. Наколькі багатыя фонды музея цяпер?**

— У нас самыя вялікія фонды ў краіне. Гэта больш за 470 тысяч адзінак захоўвання разам са зборамі ўсіх філіялаў. Гэта і асноўныя фонды, і дапаможныя. У нас 58 калекцый. Улічваючы тое, што ўся дзейнасць музея грунтуецца вакол музейнага прадмета, яго захавання, вывучэння, кансервацыі, рэстаўрацыі, дэманстрацыі, то менавіта аб фондах мы заўсёды гаворым з найбольшым гонарам.

Канешне, і ў міжваенны перыяд, і за гады Вялікай Айчыннай вайны было страчана шмат. Дзякуй Богу, што тагачасныя музейныя супрацоўнікі былі сапраўднымі патрыётамі. Ёсць шмат прыкладаў, калі яны ратавалі музейныя прадметы. Так, сыпалі на абразы зерне, і яны знаходзіліся ў розных сельскагаспадарчых прыстасаваннях. Ніхто не мог і падумаць, што яны так выкарыстоўваюцца. І гэта толькі адзін прыклад. Навуковыя супрацоўнікі, захавальнікі музея ў перыяд эвакуацыі і падчас вайны зрабілі вялікую справу. Дзякуючы гэтаму многія экспанаты пазней былі ўведзены ў кантэкст нацыянальнай памяці нашай краіны і склалі значную частку музейных фондаў.

Так атрымалася, што шмат нашых гісторыка-культурных каштоўнасцяў у розны час апынулася за мяжой, многія былі страчаны і знішчаны. Гэта не толькі праблема нашага музея, але і іншых устаноў краіны. Таму працэс рэстытуцыі вельмі для нас важны: мы працуем з консульствамі, амбасадамі, нешта вяртаецца, заўсёды рады і факсімільным выданням, копіям, часоваму экспанаванню. Мы назіраем, як добра супрацоўнічае Нацыянальная бібліятэка па выпуску факсімільных выданняў, розных кніжных помнікаў культуры, як працуе з тымі ж дыпламатычнымі місіямі Нацыянальны мастацкі музей. Працуем у гэтым плане і мы. Аднак, нягледзячы на гэтыя акалічнасці, наша калекцыя мае вельмі моцны патэнцыял.

У музеі захоўваецца вельмі добры беларускі матэрыял. Гэта тычыцца этнаграфіі, народных промыслаў і рамёстваў, нумізматыкі, сфрагістыкі, выяўленчых твораў, дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, зброі. Наш музей сапраўды нацыянальны і гістарычны. І калі мы вядзем перамовы, дамаўляемся аб розных выставах, напрыклад у межах дзён культуры Беларусі ў замежных краінах, канешне, нашы партнёры ў першую чаргу цікавяцца беларускай тэмай, і мы з вялікім задавальненнем, з пачуццём годнасці прадстаўляем гэтыя экспанаты і заяўляем усяму свету аб Беларусі як аб краіне з моцнай гісторыка-культурнай спадчынай, аб беларусах як аб нацыі.

**— Нацыянальны гістарычны музей чакае сур'ёзнае абнаўленне. Цяпер ідзе падрыхтоўка да ўзвядзення новага будынка музея. Што зменіцца і якім будзе музей? Як вы яго ўяўляеце? Калі нам чакаць яго адкрыццё?**

— На выдзеленай пляцоўцы будаўнічая тэхніка павінна з'явіцца ў красавіку наступнага года. На сённяшні дзень падрыхтавана архітэктурна-мастацкае рашэнне пастаяннай экспазіцыі музея. Значна павялічыцца выставачная плошча музея — да 5 тысяч квадратных метраў. Цяпер яна складае каля 2 тысяч квадратных метраў, на пастаянную экспазіцыю нават тысячы няма. На вялікі жаль, гісторыя Беларусі паказана фрагментарна.

У новым будынку мы ставім задачу паказаць комплексна, сістэмна і цэласна гісторыю Беларусі ад першабытнасці да сённяшняга дня. Мы хочам прадставіць наш гістарычны шлях, асаблівасці станаўлення беларускай нацыі, нашыя дасягненні і перамогі. Наша задача і ў тым, каб пра беларускую гісторыю да-




*Будынак Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.*
Фота А.Леуса.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ







*Фрагмент экспазіцыі музея.* Фота В.Дняпроўскага. 2019 г.

ведаліся і замежныя госці, і самі беларусы, бо, на вялікі жаль, не ўсе добра яе ведаюць і ганарацца сваёй краінай. Многія ўспрымаюць нашу краіну праз прызму розных стэрэатыпаў. Хацелася б, каб новая экспазіцыя гэтыя стэрэатыпы парушыла.

Значную ўвагу мы звяртаем на прэзентацыйны зал, які будзе своеасаблівай прэамбулай да ўваходу ў экспазіцыю на першым паверсе. Цяпер распрацоўваем невялікі відэафільм па прыкладзе вядучых музейных устаноў розных краін свету. Я быў уражаны тым, як гэта зроблена ў Шанхайскім гістарычным музеі. Калі ты прыходзіш у музей, заходзіш у залу памерам прыблізна 100—200 квадратных метраў, дзе знаходзіцца вялікі экран, на ім дэманструецца кароткі фільм, хвілін на 15, які дае асноўную інфармацыю аб гісторыі Кітая ад Канфуцыя да Сі Цзіньпіна. І ты разумееш, што гэта краіна з багатай гісторыяй, гэта асобная цывілізацыя, адметная культура. Наш фільм будзе зроблены на аснове фактаў, цікавай інфармацыі пра нашу гісторыю і культуру, значныя падзеі, пра славутых людзей Беларусі...

Для нас вялікім дасягненнем з'яўляецца тое, што калі мы прыедзем у новы будынак, з якога выйдуць будаўнікі, то будзем цалкам разумець, што і дзе павінна знаходзіцца. Адна справа — прыстасоўваць экспазіцыю пад плошчу, а тут плошча прыстасоўваецца да патрэб музея і яго экспазіцыі. І дзякуй архітэктару Алегу Арсенцьевічу Вараб'ёву, які ўлічваў пажаданні нашых супрацоўнікаў, якія шчыльна працавалі з навукоўцамі і мастакамі. Мастацкае рашэнне экспазіцыі распрацаваў творчы калектыў Мастацкага камбіната Беларускага саюза мастакоў. А да гэтага стваралася канцэпцыя музея, яго тэматыка-экспазіцыйныя планы, разам з навукоўцамі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сёлета быў створаны экспертны савет на базе нашага музея, у які ўвайшлі навукоўцы, музейшчыкі, архітэктары, дызайнеры, мастакі, іншыя спецыялісты. Яны давалі парады, мы лічыліся з рознымі пунктамі погляду, атрымлівалі кансультацыі, выносілі на экспертызу распрацоўкі па экспазіцыі кожнага гістарычнага перыяду, кожнага паверха, кожнай залы.

**— Наколькі я разумею, гэта будзе новы музей не толькі па плошчы, не толькі па экспазіцыі, але і па розных магчымасцях, якія даюць цяпер новыя тэхналогіі.**

— Абавязкова. Будуць выкарыстоўвацца розныя сродкі дапоўненай і віртуальнай рэальнасці, мультымедыйныя, інтэрактыўныя тэхналогіі. Але для нас вельмі важна вытрымаць баланс. Таму што ў свеце ёсць музеі, створаныя цалкам дзякуючы інтэрактыўным тэхналогіям, але, калі мы трапляем у музей і бачым перанасычанасць гэтымі тэхналогіямі, разумеем, што іх фонды небагатыя. І сапраўды, гэтак так.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Супрацоўнікі гэтых музеяў кажуць, што выкарыстоўваюць вялікую колькасць мультымедыйных сродкаў таму, што ў іх папросту няма што паказваць.

У аснове экспазіцыі нашага музея будзе выкарыстоўвацца шмат арыгінальных музейных прадметаў, а ўсе інсталяцыі, усе мультымедыйныя экраны, розныя галаграфічныя выявы, дапоўненая рэальнасць і г. д. будуць дадатковымі сродкамі.

Цяпер у нас выстаўлены прыкладна адзін адсотак ад нашых фондаў. У новым будынку мы зробім цікавую экспазіцыю, у нас яшчэ плануецца дзве музейныя прасторы — гэта нумізматычны кабінет па сістэме адкрытага фондасховішча і зала беларускай этнаграфіі. У выніку мы зможам паказаць прыблізна 15—20 адсоткаў ад усіх фондаў. Гэта вельмі сур'ёзная лічба. І гэта не мара. Нашы супрацоўнікі падрыхтавалі матэрыялы для экспазіцыі, якія мастакі размясцілі ў будучай прасторы музея ў віртуальнай форме. Гэта цалкам абгрунтавана, лагічна выверана, узгоднена і зацверджана, у тым ліку навуковай супольнасцю.

**— Сапраўдны музей — гэта жывая ўстанова, фонды якой пастаянна папаўняюцца. Якія цікавыя экспанаты за апошнія гады з'явіліся ў музеі?**

— Мы атрымліваем прыблізна 3-4 тысячы музейных прадметаў у год. Гэта шмат. Яны ўводзяцца ў асноўныя і дапаможныя фонды. Трапляюць да нас яны па-рознаму. Па-першае, гэта дзяржаўныя закупкі. Напрыклад, у гэтым годзе мы набылі творы выдатнага беларускага мастака Віктара Барабанцава на гістарычную тэматыку, плануем іх выкарыстаць у афармленні экспазіцыі музея. Набылі фотаздымкі славутага беларускага фатографа Юрыя Іванова — серыю фотапартрэтаў дзеячаў беларускага, тэатральнага і музычнага мастацтва для нашага філіяла — Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры. Па-другое, гэта дарэнне. Мы атрымліваем ад прыватных асоб шмат цікавых рэчаў і вельмі ім за гэта ўдзячны. Так, сем'і народных мастакоў Беларусі Мая Данцыга і Георгія Паплаўскага перадалі шэраг іх асабістых рэчаў і твораў у наш музей. Напрыклад, эцюднік Мая Данцыга, з якім ён вандраваў і пісаў цудоўныя творы. Нашы калекцыі папоўніліся прадметамі з этнаграфічнай калекцыі Георгія Паплаўскага, якія перадала яго жонка Наталля Мікалаеўна. Па-трэцяе, гэта тыя прадметы, якія трапляюць па выніках розных навуковых экспедыцый — этнаграфічных, археалагічных. Так, у гэтым



*Фрагмент экспазіцыі "Беларусь: адраджэнне духоўнасці". Фота В.Дняпроўскага. 2019 г.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ



*Фрагмент камплекта паясных пласцін ("Пояс Вітаўта").*
Канец XIV — першая трэць XV ст.

годзе беларускія археолагі выправіліся ў экспедыцыі па розных рэгіёнах нашай краіны, і я спадзяюся, што мы атрымаем ад іх цікавыя прадметы.

Частку экспанатаў мы набываем за кошт музея і за кошт спонсарскіх сродкаў. Напрыклад, дзякуючы кампаніі JTI, генеральнаму партнёру нашага музея, мы прыдбалі цікавую калекцыю срэбных кілішкаў у аднаго з прыватных калекцыянераў. Яны зараз знаходзяцца ў экспазіцыі "Беларусь: адраджэнне духоўнасці", дзе яшчэ падпісаныя як прадметы з прыватнай калекцыі. Гэта ўжо артэфакты музея. У гэтым годзе плануем набыць некаторыя цікавыя рэчы з прыватнай калекцыі вядомага калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава. Мы з ім добра супрацоўнічаем — толькі ў 2018 годзе рэалізавалі два выставачныя праекты да 100-годдзя з дня заканчэння Першай сусветнай вайны.

**— Напэўна, у кожнага музейшчыка ёсць свае любімыя экспанаты. Якія яны ў Вас?**

— Калі я яшчэ вучыўся ў школе, мне вельмі падабаліся змешчаныя ў падручніках партрэты з серыі каляровых літаграфій Валянціна і Ляілі Варэцаў "Славутыя дзеячы Беларусі". У фондах музея знаходзіцца 24 такія выявы, некалькі партрэтаў змешчаны ў асноўнай экспазіцыі. У 2018 г. мы ўдзельнічалі ў міжнароднай акцыі Савета Еўропы "Дні Еўрапейскай спадчыны", дзе прадставілі ў Палацы Незалежнасці арыгіналы, у самім музеі выставілі копіі, выдалі буклет, дзе змешчана інфармацыя аб кожнай асобе, а гэта Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Ягайла, Барбара Радзівіл, Леў Сапега, Казімір Семяновіч, Адам Міцкевіч, Паўлюк Багрым, Максім Багдановіч і іншыя знакамітыя асобы. Цяпер копіі мы можам экспанаваць у розных краінах, амбасадах. Тым больш гаворка ідзе аб асобах, якія ствараюць пантэон знакамітых дзеячаў беларускай гісторыі, культуры і г. д. Гэта і так званы "Пояс Вітаўта", які любяць усе нашы музейныя супрацоўнікі, гэта гісторыка-культурная каштоўнасць першай катэгорыі. Цяпер ён прадстаўлены ў Казанскім крамлі ў Татарстане, на міжнароднай выставе, якая называецца "Залатая Арда і Прычарнамор'е. Урокі Чынгісідскай Імперыі", дзе свае экспанаты дэманструюць больш за 15 вядучых музеяў Расіі.

**— Яшчэ аднной вельмі важнай сферай для музея з'яўляецца навуковая дзейнасць. У кожнага музейнага прадмета ёсць свая гісторыя, але, на жаль, яна часта схаваная і патрабуе грунтоўнага даследавання.**

— На мой погляд, праца над любой экспазіцыяй, у тым ліку і часовай, з'яўляецца паўнавартасным даследаваннем. Падчас яе выяўляюцца розныя цікавыя факты і акалічнасці. Дзякуючы гэтым цікавосткам мы даведваемся шмат новага пра гісторыю экспанатаў, робім экспазіцыю, выставу больш прыцягальнай і цікавай.

У нашым музеі даследуюцца і асобныя прадметы, і цэлыя калекцыі. Сёння кожны навуковы супрацоўнік, захавальнік калекцыі з'яўляецца і праекціроўшчыкам новай экспазіцыі, выконвае шмат функцый, у тым ліку і навуковую. У нас ёсць супрацоўнікі, якія даследуюць асобныя калекцыі. Напрыклад, вядучы навуковы су-



*Фрагмент экспазіцыі музея з партрэтам Казіміра Семяновіча (мастакі В. і Л. Варэцы).*
Фота В.Дняпроўскага. 2019 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




працоўнік аддзела рэчавых помнікаў Марыя Казанцава даследуе калекцыю фарфору. Калі быў закрыты Мінскі фарфоравы завод, уся яго калекцыя была перададзена нашаму музею. Дагэтуль таксама існавала добрая калекцыя фарфору Дандукова-Карсакова. Яна будзе прэзентаваная на адной з выстаў у лістападзе гэтага года, да яе мы выдаем каталог, які таксама з'яўляецца паўнавартаснай навуковай працай.

Другі прыклад, — навуковая дзейнасць загадчыцы аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Надзеі Саўчанка, яна даследуе фотаспадчыну Савы Сіўко. Падчас адной з экспедыцый былі знойдзены розныя аскепкі шкляных негатываў, фотаэкран — дыван, на фоне якога Сава Сіўко рабіў фотаздымкі. Гэта было сапраўднае адкрыццё імя выдатнага творцы, які жыў у мястэчку Любча Навагрудскага раёна.

Дзякуючы гранту Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры, адукацыі, аховы здароўя і навукі, наш рэстаўратар Юлія Дранец зрабіла ўсё, каб вярнуць жыццё ў гэты дыван-фотаэкран, які экспанаваўся падчас адной з выстаў. Надзея Саўчанка падрыхтавала каталог на 270 старонак. У гэтым годзе ён пабачыць свет дзякуючы кампаніі JTI.

Наогул, кожны, хто вядзе тую ці іншую калекцыю, праводзіць навуковыя даследаванні, выступае на прэстыжных канферэнцыях, публікуе матэрыялы ў калектыўных манаграфіях, зборніках дакладаў, у часопісах.

**— Адзначу, што многія вынікі навуковай дзейнасці супрацоўнікаў музея прадстаўлены на старонках гэтага нумара "Беларускага гістарычнага часопіса".**

— За што мы рэдакцыі часопіса вельмі ўдзячныя.

**— Лагічным будзе пытанне наконт выдавецкай дзейнасці музея.**

— Для мяне асабіста, як для чалавека, які працуе ў музеі гэта вельмі важны накірунак — выдавецкая справа і праца са сродкамі масавай інфармацыі. Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, які я закончыў, знакаміты драматург Алесь Петрашкевіч, напісаў п'есу пра Францыска Скарыну і назваў яе "Напісанае застаецца". Сапраўды, напісанае, надрукаванае застаецца. Гэта вельмі важна. У апошнія гады мы зрабілі добрыя выданні, адно з іх прысвечанае мастакам Парыжскай школы з Беларусі. Гэта каталог выставы "Майстры Манпарнаса з беларускіх мястэчак", зроблены дзякуючы падтрымцы прыватных калекцыянераў з Беларусі і Расіі, амбасад Беларусі ў Францыі, Францыі ў Беларусі. Цяпер мы рыхтуем выданне каталога выставы "Сакральная культура касцёла Беларусі", па благаславенні архібіскупа-мітрапаліта Мінска-Магілёўскага Тадэвуша Кандрусевіча. Да выдання ў выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя" рыхтуецца альбом графікі, падрыхтаваны Наталляй Мартынавай. Гэта працы беларускіх графікаў 1920—1930-х гадоў з іх краязнаўчых экспедыцый. У альбоме будуць прадстаўлены графічныя творы мастакоў, якія апынуліся ў эпіцэнтры краязнаўчага руху ў перыяд беларусізацыі. На іх адлюстраваныя знакамітыя аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны з розных рэгіёнаў нашай краіны. Там ёсць знакавыя імёны Язэпа Драздовіча, Пётры Сергіевіча, а ёсць і малавядомыя — тых мастакоў, якія, на вялікі жаль, рана пайшлі з жыцця.

Мы плануем у бліжэйшы час працаваць над серыяй выданняў па нашых калекцыях. Я заўсёды зайздрошчу некаторым калегам з замежжа, якія змаглі ўсё лепшае, што знаходзіцца ў іх музейных зборах, выдаць невялічкімі кніжачкамі, брашуркамі. Гэта важная папулярызатарская дзейнасць. Многія выставачныя праекты таксама маюць на мэце падрыхтоўку выданняў. Напрыклад, па выніках міжнароднага тыдня мастацкай адукацыі ЮНЕСКА і ў межах Года малой радзімы мы правялі выставу жывапісу навучэнцаў беларускіх школ мастацтваў, выдалі каталог. Таксама зрабілі каталог выставы па выніках Першага рэспубліканскага конкурсу "Трыенале маладых мастакоў", арганізаванай Нацыянальным гістарычным музеем. Вучоны сакратар музея Алег Іванавіч Ладзісаў працуе над праектам "Музей і прыватныя калекцыянеры", будзе выдадзены каталог выставы, падрыхтаваны нумар часопіса "Музейны веснік" па выніках пасяджэння навукова-практычнага круглага стала, якое будзе праходзіць у межах экспазіцыі ўжо ў гэтым годзе.

Па даручэнні Савета Міністраў і Міністэрства культуры сумесна з рэдакцыйна-выдавецкай установай "Культура і мастацтва" рыхтуем навукова-папулярны часопіс, прысвечаны пытанням музейнай справы, які будзем выдаваць раз у квартал.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

**— Звернемся да яшчэ адной сферы дзейнасці музея — выставачнай. Музей штогод ладзіць шмат выстаў рознага кшталту. Якія з апошніх выклікалі найбольшую цікавасць?**

— Найперш выставы, прысвечаныя стагоддзю БНР і БССР, яны аказаліся вельмі запатрабаваныя. Дзве выставы, прысвечаныя стагоддзю заканчэння Першай сусветнай вайны, якія мы зладзілі сумесна з калекцыянерам, лаўрэатам прэміі "За духоўнае адраджэнне" Уладзімірам Ліхадзедавым. Цікавасць выклікала выстава "Майстры Манпарнаса з беларускіх мястэчак". Безумоўна, выставы з замежных фондаў, напрыклад "Срэбранае стагоддзе ювеліраў Расіі" з фондаў Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Мы ладзілі шэраг міжнародных праектаў з нашымі калегамі з Польшчы, Эквадора, Эстоніі. Напрыклад, фотавыстава "100 дамоў у Пярну": знакаміты эстонскі фотамайстра Андрэс Адамсан зрабіў фотаздымкі розных дамоў эстонскага горада Пярну, на якіх кожны інтэр'ер, кожная кватэра, кожная прастора, кожны асяродак адлюстроўваюць сваю філасофію, і публіка пайшла. Вельмі добра супрацоўнічаем з нашымі польскімі калегамі. У нас была выстава польскіх грошай, якая называлася "Знакі незалежнасці. Польскія грошы 1915—1939 гг.", прымеркаваная да стагоддзя незалежнасці Польшчы. Сумеснымі намаганнямі музея і Польскага Інстытута ў Мінску і асабіста яго дырэктара Цэзарыя Карпіньскага прадстаўляем беларускай грамадскасці копію акта Люблінскай уніі разам з копіяй карціны Яна Матэйкі "Люблінская унія". Выдадзім буклет, у якім будуць пазначаны ўсе тыя асобы, якіх адлюстраваў мастак. Вядома, што некаторыя ў час падпісання уніі былі ў іншых месцах, а некаторыя пайшлі з жыцця, але прысутнічаюць на карціне. І гэта тым больш цікава.

У гэтым годзе мы ўжо зладзілі шэраг цікавых выстаў. Я ганаруся выставай да Другіх еўрапейскіх гульняў, якая называлася "Наш край любімы Беларусь". Яна была прысвечана беларускай гісторыі і культуры, і наша задача была ў тым, каб паказаць замежным гасцям беларускую гісторыка-культурную спадчыну, у тым ліку нематэрыяльную. Гэта былі музейныя прадметы і творы сучасных беларускіх мастакоў: Леаніда Шчамялёва, Мікалая Кузьміча, Рыгора Сітніцы, Тамары Васюк, Алы Непачаловіч, Уладзіміра Тоўсціка, Уладзіміра Слабодчыкава і іншых.

Шмат чым мы здзіўляем і замежную аўдыторыю. У Нацыянальным музеі Султаната Аман мы зладзілі выставу "Беларусь на скрыжаванні цывілізацый". У Калінінградскім абласным гісторыка-мастацкім музеі паказалі творчасць Напалеона Орды; выставу, прысвечаную 110-годдзю дыпламата Андрэя Грамыкі прадэманстравалі ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Беларускія скарбы знайшлі месца ў экспазіцыі адной з выстаў у Магдэбургскім гісторыка-мастацкім




музеі. Цяпер рыхтуем выставу іканапісу з выданнем каталога ў Этнаграфічным музеі ў Белградзе. Прымаем удзел у днях культуры Беларусі ў іншых краінах.

Шчыльна працуем і з рэгіёнамі: выстава музычных інструментаў у межах Міжнароднага фестывалю "Славянскі базар у Віцебску", выстава ваеннага плаката ў межах Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2019", выстава "Куншты маляваныя" да Дня беларускага пісьменства ў Слоніме, выстава да 200-годдзя Станіслава Манюшкі ў Оршы і інш.

Штогод мы праводзім больш за 100 выстаў. І гэта я яшчэ не сказаў пра філіялы. Музей гісторыі беларускага кіно, Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, Музей прыроды і экалогіі, Дом-музей І з'езда РСДРП штогод ладзяць цікавыя выставы. Вялікая колькасць праектаў рэалізуецца да розных юбілейных, знакавых, памятных дат — да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 100-годдзя дыпламатычнай службы Беларусі, 65-годдзя ўступлення Беларусі ў ЮНЕСКА, 25-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, 20-годдзя Саюзнай дзяржавы і інш.

**— Сапраўды, музей ладзіць шмат цікавых выстаў. Аднак ці ўплывае гэта на яго наведванне? Як зрабіць Нацыянальны гістарычны музей яшчэ больш прыцягальным і цікавым?**

— Некаторыя людзі думаюць, што музей — гэта экспазіцыя, створаная дзесяцігоддзі таму, экспанаты, якія захоўваюцца, рэстаўруюцца, але адна з галоўных задач музея — папулярызацыя, трансляцыя, дэманстрацыя, рэпрэзентацыя. Цяпер мала толькі захаваць і вывучыць музейны прадмет, яго трэба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*3D-макет Крэўскага замка ў экспазіцыі музея.* Фота В.Дняпроўскага. 2019 г.

паказаць, і паказаць найбольш шырока, таму што ён мае не толькі гісторыка-культурнае значэнне, але і адукацыйнае, асветніцкае, выхаваўчае...

Наведвальнікі прыходзяць, але хацелася б больш і нашмат больш. Гэта, канешне, і эканамічна-фінансавы складнік і маральнае задавальненне. Штогод музей разам з філіяламі наведвае каля 400—450 тысяч чалавек. Каб наведвальнік прыйшоў у музей, яму павінна быць цікава. Па-першае, трэба працаваць з цікавым матэрыялам. Па-другое, ладзіць розныя імпрэзы, дзе б меў месца дыялог. Гэта і прэзентацыя выданняў, аўтарскія лекцыі, розныя спецыяльныя экскурсіі, літаратурна-музычныя салоны, творчыя вечарыны, якія павінны адпавядаць двум словам у нашай назве, нацыянальны і гістарычны, абавязкова.

Мы павінны рабіць шоу ў пазітыўным сэнсе гэтага слова. Напрыклад, у нас была выстава "Моднае стагоддзе", дзе былі паказаныя прадметы з калекцыі вядомага гісторыка моды Аляксандра Васільева, але яна мела гістарычны кантэкст. Гэта была камерцыйная выстава, многія наведвальнікі пайшлі на імя. У яе межах былі розныя цікавосткі, розныя актыўнасці.

Цяпер існуе такое меркаванне, што настаўнік павінен не толькі даваць веды, але і цікава распавядаць, сам павінен быць цікавым, харызматычным чалавекам. Тое ж самае тычыцца і выкладчыкаў і экскурсаводаў. Ведаеце, я з гэтым згодзен. Безумоўна, экскурсавод не павінен быць шоуменам, аніматарам, але павінен быць чалавекам зацікаўленым, цікавым, харызматычным, на якога пойдуць. У нас ёсць некалькі экскурсаводаў, якія з'яўляюцца візітнымі карткамі музея. Яны праводзяць экскурсіі па пастаяннай экспазіцыі, па часовых выставах, робяць спецпраекты. У нас дзейнічае аддзел музейных камунікацый, сектар музейнай педагогікі, які працуе з наведвальнікамі і ладзіць розныя дзіцячыя акцыі, імпрэзы, мерапрыемствы. Цікавасць — вельмі важны крытэрый.

Патрэбна і шырокая папулярызацыя ў сродках масавай інфармацыі: на тэлебачанні і радыё, у часопісах і газетах, абавязкова ў сацыяльных сетках, рэклама ў метро, "сарафаннае" радыё, мы павінны быць усюды. У нас многае атрымліваецца, але хацелася б лепш, больш, цікавей, і гэта нармальна. Папулярызатарская праца не толькі гістарычнай спадчыны, але і праектнай дзейнасці музея павінна быць, каб яго ведалі.

На вялікі жаль, цяпер нам не хапае плошчаў, яны не дазваляюць прадставіць паўнавартасную экспазіцыю, але мы маем вялікую надзею на новы будынак музея. Гэта будзе моцная ўстанова. Захаваецца калектыў, накірункі, вектары і стратэгія, але дзейнасць і якасць, магчымасці будуць іншымі, новымі... Ён будзе вельмі сучасным і цікавым.

**— На завяршэнне размовы пажадаю, каб усе планы, якія ёсць, музею атрымалася рэалізаваць, каб удалося прыцягнуць як мага больш наведвальнікаў, якія будуць хадзіць у музей пастаянна і стануць яго сапраўднымі сябрамі.**

— Шчыры дзякуй! Я спадзяюся, што наша супрацоўніцтва будзе працягвацца і пашырацца.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ